Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 КРАСАВІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 60 (28170) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Сезон велікодных кірмашоў**

СТАР. 3



**Зорныя жарты ў Дзень смеху**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Кіраўнік прадпрыемства павінен быць гаспадаром. Ён абавязаны кантраляваць усе рэсурсы, фінансавыя патокі, затраты, каб расходаваць сродкі максімальна эфектыўна. Многія беларускія прадпрыемствы працуюць стабільна. Там ёсць добрыя кіраўнікі, ёсць каманда. А гэта сёння самае галоўнае».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20139,00 | ▲ |
| Еўра | 22828,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 297,02 | ▼ |
| Укр. грыўня | 768,66 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X



# ВЯСНА НА РОДНАЙ ЗЯМЛІ

**Падпісчык «Звязды» з 40-гадовым стажам, жыхар вёскі Ленін Жыткавіцкага раёна Васіль ВЯРЭНІЧ сустракае сёлетнюю вясну не толькі чарговай падпіскай, але і загадзя змайстраванымі для птушак хаткамі. Асаблівае месца ў ягоным садзе-агародзе займаюць шпакі і сінічкі, бо, на думку пенсіянера, сініцы — найлепшыя памочнікі ў працы садавода. А яшчэ ў яго гаспадарчых клопатах ёсць надзейны дарадца — любімая «Звязда» і яе рубрыка «Крынічка».**

**«Ад якога часу ў вашым доме з'явілася газета і чаму выбралі гэтае, а не іншае выданне?» — запытаў я былога дырэктара школы, які ўжо пяць гадоў на заслужаным адпачынку.**

**— Калі служыў у арміі, назіраў, як мае саслужыўцы, а яны былі з розных рэспублік былога Саюза, збіраліся разам, размаўлялі на сваіх мовах, — адказаў Васіль Афанасьевіч.— І толькі мы, беларусы, не мелі звычкі гаварыць на роднай мове. Я адчуваў недахоп ведаў і практыкі валодання мовай. Пасля войска і стаў выпісваць «Звязду».**

**На пенсіі любімым заняткам Васіля Вярэніча стала вырошчванне руж — самых розных гатункаў. Нават ярлыкі на чаранкі кветкавод падпісвае на роднай мове.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*anatol@zviazda.by*

■ Ад фантастыкі — да рэальнасці

# СПАДЧЫННАСЦЬ ПАДДАЕЦЦА КАРЭКЦІРОЎЦЫ

Навукоўцы ўпэўненыя, што генетычны сцэнарый — яшчэ не прысуд

**На думку большасці навукоўцаў, ад 75 да 90% нашай «асобы» вызначае спадчынная інфармацыя і толькі ад 10 да 25 працэнтаў — умовы жыцця. Вынікам рэалізацыі міжнароднай праграмы «Геном чалавека» стала поўная расшыфроўка генетычнага кода — навукоўцам удалося «прачытаць» 3 мільярды нуклеатыдных пар чалавечай ДНК. Сабраная інфармацыя сёння дапамагае навукоўцам зразумець, колькі варыяцый мае кожны ген і якія з гэтых варыяцый нясуць адказнасць за развіццё ў чалавека розных захворванняў. Аб гэтым ішла гаворка падчас міжнароднага навукова-практычнага семінара, які арганізаваў Інстытут генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук сумесна з Беларускай медыцынскай акадэміяй паслядыпломнай адукацыі.**



Фота Надзеі БУЖАН.

**ЛЕКІ, ЯКІЯ «ЗАБІВАЮЦЬ»**

Ёсць захворванні, якія на 100 працэнтаў залежаць ад спадчыннасці. З імі дзіця альбо нараджаецца, альбо яны неміnуча праяўляюцца ўжо ў сталым узросце. Напрыклад, хваробы Паркінсана і Альцгеймера. Многія іншыя захворванні (нават частыя прастуды і схільнасць да траўматызму) таксама маюць генетычную прыроду, але залежаць і ад ладу жыцця чалавека.

СТАР. 4

■ Надвор'е

# СЁННЯ І Ў СУБОТУ МОЦНЫЯ АПАДКІ І ПАХАЛАДАЕ

Ужо ў аўторак сіноптыкі абяцаюць да 16 цяпла

**У найбліжэйшыя двое сутак на тэрыторыі Беларусі прагназуецца пагаршэнне надвор'я, чакаюцца ападкі рознай інтэнсіўнасці і парывісты вецер, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**



Фота БЕЛТА.

Ужо сёння ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы, па паўночным захадзе — з мокрым снегам, месцамі па паўднёвым усходзе — моцныя дажджы, магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра складзе 4-9 цяпла, а па паўднёвым усходзе — плюс 10-12 градусаў. У суботу наша краіна застанецца яшчэ пад уплывам франтальных раздзелаў, таму на большай частцы Беларусі чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, месцамі моцныя ападкі. Удзень будуць яшчэ гаспадарыць паветраныя масы, якія паступаюць з паўночнага захаду Еўропы. Потым ападкаў стане менш, і пройдуць яны пераважна па ўсходняй частцы краіны. Уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца.

СТАР. 3